*ЗАЦВЕРДЖАНА*

*Пастанова*
*Міністэрства культуры*
*Рэспублікі Беларусь*
*29.01.2016 № 1*

# ІНСТРУКЦЫЯ
**аб парадку арганізацыі і правядзення Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі**

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі (далей – конкурс).

2. Мэтамі конкурсу з’яўляюцца:

выяўленне і падтрымка таленавітай моладзі, развіццё яе творчых здольнасцей і павышэнне ўзроўню выканальніцкага майстэрства;

развіццё і папулярызацыя лепшых традыцый эстраднага музычнага мастацтва і далучэнне да іх шырокіх слаёў грамадства;

арганізацыя культурнага адпачынку (вольнага часу) і эстэтычнае выхаванне насельніцтва.

3. Арганізатарамі конкурсу з’яўляюцца Міністэрства культуры, структурныя падраздзяленні абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры (далей – галоўныя ўпраўленні), структурныя падраздзяленні раённых (гарадскіх) выканаўчых камітэтаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры (далей – аддзелы), дзяржаўная ўстанова «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Нацыянальны акадэмічны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь» (далей – Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі).

4. Конкурс праводзіцца штогод у рамках правядзення Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі. Канкрэтныя тэрміны правядзення конкурсу вызначаюцца арганізатарамі конкурсу.

5. Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца выканаўцы, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, ва ўзросце ад 16 да 31 года ўключна па стане на 1 чэрвеня года правядзення конкурсу (далей – удзельнікі).

6. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размяшчаецца не пазней за месяц да пачатку правядзення конкурсу ў газеце «Культура», на афіцыйных сайтах Міністэрства культуры, галоўных упраўленняў і аддзелаў у глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт і павінна змяшчаць звесткі пра час, месца правядзення конкурсу, умовы конкурсу, крытэрыі і парадак ацэнкі выкананняў удзельнікаў, парадак і тэрміны абвяшчэння вынікаў конкурсу, а таксама іншыя неабходныя звесткі.

7. Конкурс праводзіцца ў тры этапы:

першы этап (раённы, гарадскі) з’яўляецца адборачным і праводзіцца аддзеламі;

другі этап (абласны, Мінскі гарадскі) з’яўляецца адборачным і праводзіцца галоўнымі ўпраўленнямі;

трэці этап (рэспубліканскі) з’яўляецца заключным і праводзіцца Нацыянальным акадэмічным канцэртным аркестрам Беларусі ў рамках правядзення Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі.

Парадак і тэрміны правядзення этапаў конкурсу вызначаюцца арганізатарамі конкурсу.

8. Для ажыццяўлення кіраўніцтва арганізацыяй і правядзеннем конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт (далей, калі не ўстаноўлена іншае, – аргкамітэт), склад якога зацвярджаецца Міністэрствам культуры па ўзгадненні з іншымі арганізатарамі конкурсу.

Аргкамітэт адначасова з’яўляецца арганізацыйным камітэтам заключнага этапу конкурсу.

9. Для непасрэднага кіраўніцтва арганізацыяй і правядзеннем адборачных этапаў конкурсу ствараюцца арганізацыйныя камітэты адборачных этапаў конкурсу (далей – аргкамітэты адборачных этапаў), склад якіх зацвярджаецца адпаведна галоўнымі ўпраўленнямі і аддзеламі.

10. Склад аргкамітэта і аргкамітэтаў адборачных этапаў фарміруецца з ліку прадстаўнікоў дзяржаўных органаў (са згоды іх кіраўнікоў), іншых зацікаўленых арганізацый, творчых работнікаў.

11. Аргкамітэт:

ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва арганізацыяй і правядзеннем конкурсу;

разглядае і зацвярджае склад прафесійнага журы заключнага этапу конкурсу (далей – журы);

ажыццяўляе ўзаемадзеянне з зацікаўленымі арганізацыямі па пытаннях арганізацыі, правядзення конкурсу і яго асвятлення ў сродках масавай інфармацыі;

вырашае іншыя пытанні, якія ўзнікаюць падчас арганізацыі і правядзення конкурсу.

12. Аргкамітэт адборачнага этапу:

ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва арганізацыяй і правядзеннем адборачнага этапу конкурсу;

зацвярджае склад журы адборачнага этапу конкурсу;

зацвярджае спіскі ўдзельнікаў, якія дапушчаны да ўдзелу ў заключным этапе конкурсу;

ажыццяўляе ўзаемадзеянне з зацікаўленымі арганізацыямі па пытаннях арганізацыі, правядзення адборачных этапаў конкурсу і іх асвятлення ў сродках масавай інфармацыі;

вырашае іншыя пытанні, якія ўзнікаюць падчас арганізацыі і правядзення адборачных этапаў конкурсу.

13. Пасяджэнні аргкамітэта і аргкамітэта адборачнага этапу конкурсу лічацца правамоцнымі, калі ў іх пасяджэннях прымалі ўдзел не менш за дзве трэція часткі яго складу.

Рашэнне аргкамітэта і аргкамітэта адборачнага этапу прымаецца шляхам адкрытага галасавання і лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала больш паловы членаў адпаведнага аргкамітэта, якія прысутнічалі на пасяджэнні.

Рашэнне аргкамітэта і аргкамітэта адборачнага этапу афармляецца пратаколам, які падпісваецца старшынёй адпаведнага аргкамітэта.

14. Для ўдзелу ва ўсіх этапах конкурсу ўдзельнікі прадстаўляюць дзве песні беларускіх аўтараў на беларускай мове працягласцю не больш за 3 хвіліны 40 секунд.

У адборачных этапах конкурсу выконваюцца песні ў суправаджэнні фанаграмы «мінус адзін». Фанаграмы забяспечваюцца непасрэдна ўдзельнікамі.

На заключным этапе конкурсу адна песня выконваецца ў суправаджэнні фанаграмы «мінус адзін», другая песня – у суправаджэнні Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі.

15. Да ўдзелу ў заключным этапе конкурсу ад кожнай вобласці і горада Мінска дапускаюцца па тры ўдзельнікі.

16. Галоўныя ўпраўленні на ўдзельнікаў, якія дапушчаны да ўдзелу ў заключным этапе конкурсу, прадстаўляюць у Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі наступныя матэрыялы:

заяўку на ўдзел у конкурсе па форме згодна з дадаткам;

ксеракопію дакумента, які сведчыць асобу;

творчую характарыстыку;

копіі дыпломаў іншых конкурсаў і фестываляў;

фотаздымак (у электронным выглядзе альбо на матэрыяльным носьбіце фармату jpg памерам не менш за 300 dpi/inch);

фанаграму «плюс адзін» і «мінус адзін» песні, якую ўдзельнік будзе выконваць у суправаджэнні Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі (у электронным выглядзе альбо на матэрыяльным носьбіце фармату mp3);

тэкст песні на папяровым носьбіце з указаннем аўтараў музыкі і слоў.

Матэрыялы, прадугледжаныя часткай першай дадзенага пункта, накіроўваюцца не пазней 20 сакавіка года, у якім праводзіцца конкурс, на адрас Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі: 220002, г. Мінск, а/с № 1. Тэл. (017) 377 42 52; факс (017) 354 74 40, e-mail: mail@orchestra.by.

17. Матэрыялы, прадстаўленыя для ўдзелу ў конкурсе, не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Матэрыялы, прадстаўленыя з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых пунктам 16 дадзенай Інструкцыі, да разгляду не прымаюцца.

18. Для ацэнкі выкананняў удзельнікаў аргкамітэтам, аргкамітэтам адборачнага этапу зацвярджаецца адпаведна склад журы конкурсу і склад журы адборачных этапаў конкурсу (далей, калі не вызначаецца іншае, – журы) у колькасці не больш за 8 чалавек у кожным складзе.

Склад журы фарміруецца з ліку педагагічных работнікаў устаноў адукацыі ў сферы культуры, творчых работнікаў, дзеячаў культуры і мастацтва, прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і іншых зацікаўленых арганізацый.

19. Журы:

праслухоўвае выкананні ўдзельнікаў і дае ім ацэнку;

вызначае пераможцаў адборачных этапаў і конкурсу.

20. Журы ацэньвае выкананні ўдзельнікаў па наступных крытэрыях:

узровень выканальніцкага майстэрства;

яскравасць выканальніцкай індывідуальнасці;

мастацкі густ;

уменне перадаць стылістычныя асаблівасці і драматургію выконваемых твораў.

21. Члены журы на працягу правядзення конкурсу ўстрымліваюцца ад публічных ацэнак таго ці іншага ўдзельніка ў сродках масавай інфармацыі.

У час пасяджэння журы знаходжанне пабочных асоб не дазваляецца.

22. Чарговасць выкананняў удзельнікаў на заключным этапе конкурсу вызначаецца жараб’ёўкай. Змена чарговасці выкананняў і заяўленых песень не дапускаецца.

23. Выкананні ўдзельнікаў ацэньваюцца па дзесяцібальнай сістэме.

24. Падвядзенне вынікаў конкурсу і адборачных этапаў конкурсу ажыццяўляецца журы адкрытым галасаваннем па кожным з удзельнікаў.

Член журы, які мае адносіны да ўдзельніка (роднасныя сувязі, навучанне, праца і іншае), не прымае ўдзел у ацэнцы выкананняў дадзенага ўдзельніка.

25. Рашэнне журы прымаецца на пасяджэннях, афармляецца пратаколам і падпісваецца членамі журы і яго сакратаром. Рашэнне лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала больш паловы прысутных на пасяджэнні членаў журы. Пры роўнасці галасоў меркаванне старшыні журы з’яўляецца вызначальным. Рашэнне журы аб’яўляецца на цырымоніі ўзнагароджання ў рамках адкрыцця ці закрыцця Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі (у адпаведнасці с зацверджанай аргкамітэтам праграмай фестывалю).

26. Журы конкурсу мае права:

не прысуджаць Гран-пры;

прысуджаць не ўсе дыпломы і прэміі;

прысуджаць некалькі дыпломаў (акрамя Гран-пры і дыплома I ступені) з падзелам прэміі ў роўных долях паміж лаўрэатамі, уладальнікамі гэтых дыпломаў;

у выпадку неприсуджэння аднаго або некалькіх дыпломаў змяняць памеры грашовых прэмій у межах сродкаў, прадугледжаных на выплату грашовых прэмій.

27. Пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца Гран-пры з уручэннем дыплома ўладальніка Гран-пры і прыза імя Уладзіміра Мулявіна, дыпломамі I, II і III ступені з прысваеннем звання лаўрэата конкурсу.

28. Пераможцам конкурсу ўстанаўліваюцца грашовыя прэміі ў памеры:

уладальніку Гран-пры – 120 базавых велічынь;

лаўрэату і ўладальніку дыплома I ступені – 100 базавых велічынь;

лаўрэату і ўладальніку дыплома II ступені – 80 базавых велічынь;

лаўрэату і ўладальніку дыплома III ступені – 60 базавых велічынь.

29. Удзельнікі заключнага этапу конкурсу, якія не атрымалі Гран-пры і дыпломы лаўрэатаў I, II і III ступені, адзначаюцца дыпломамі ўдзельнікаў.

30. Фінансаванне выдаткаў па арганізацыі і правядзенні конкурсу ажыццяўляецца за кошт:

сродкаў, якія прадугледжваюцца ў рэспубліканскім і мясцовых бюджэтах на правядзенне цэнтралізаваных мерапрыемстваў;

бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі, якая прадастаўляецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам;

іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Выдаткі на праезд удзельнікаў і суправаджаючых асоб у гарады Мінск і Маладзечна для рэпетыцый і ўдзелу ў трэцім этапе конкурсу ажыццяўляюць аддзелы, установы адукацыі і іншыя арганізацыі.

*Дадатак*
*да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі*

Форма

**ЗАЯЎКА**
**на ўдзел у конкурсе**

| | | |
|---|---|---|
| Прозвішча **Рыбакова** | | Вобласць, горад |
| | | |
| Уласнае імя **Ганна** | | Паштовы адрас удзельніка |
| Імя па бацьку (калі такое маецца) **Юреуна** | | |
| | | Месца працы (вучобы) |
| | | |
| Дзень, месяц і год нараджэння | Поўных гадоў | Тэл. |
| | | Факс |
| Дакумент, які сведчыць асобу<br>Серыя (пры яе наяўнасці) №<br><br>Кім і калі выдадзены | Сцэнічны псеўданім (пры наяўнасці) | E-mail |
| | | |
| РЭПЕРТУАР | | |
| Назва песні Гора не бяда | | |
| Кампазітар Л. Шырын | | Час гучання 3.12 |
| Аранжыроўшчык | | Носьбіт фанаграмы usb flash |
| Аўтар тэксту А. Лягчылаў | | Танальнасць Am |
| Назва песні Закаханая | | |
| Кампазітар Я. Алейнік | | Час гучання 3.07 |
| Аранжыроўшчык | | Носьбіт фанаграмы usb flash |
| Аўтар тэксту Ю. Быкава | | Танальнасць Em |

З Інструкцыяй аб парадку арганізацыі і правядзення Нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі азнаёмлены(на)

_______________________________________________

(уласны подпіс удзельніка)

Назва галоўнага ўпраўлення, якое прадстаўляе ўдзельніка ____________________________

______________________________________________________________________

Паштовы адрас ___________________________________________________________________________

___________________________________ ________________ ___________________________

(кіраўнік галоўнага ўпраўлення) (подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

______________________

(дата)